БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

...рэс рэдакцыі і адміністрацыі:
...пухоуская вул. д. № 12

...кцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
...іністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
...кцыя пакідае за сабой права на... ляць перасыланые рукапісы і карэспонденцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш петыту на 1-й стран. 1 руб на апошняй—50 кап.

№ 53. Менск. Серада 29 мая 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Ад харчавога камітэту астаюцца пакуль што на далей ...нены на усе дні тыдня:
Ігнатычы, Захароуская 37 і 73.
Пад слонем,
Бэйлановіч,
Ландрэс,
Рэстарацыя Берловіч,
Рэстарацыя Фэльдман.

Штадтгауптман **ГЭРШЭЛЬ**.

Менск 29/v.

...чора мы пісалі аб тых ...кметах якія гаворуць аб ...ене тактыкі к.-д. партыі ...Украіне і у Вялікаросіі.

...эуныя весткі кажуць, што ...ялікаросіі істнуе у гандл...-прамысловых колах навараты у бок нямецкай арыентацыі.

...олы гэтыя найбольш моц... выступаушыя за хаурус з ...ліяй—проці Нямеччыны і ...трымоуваушыя вайну, цяпер зьнівераныя у сваіх сілах. ...дайсьці да парадку у ...іі, зьніверанныя у сілах і ...ырасьці даувейшых хаурусьнікау, гатовы зьвярнуцца ...бліжэйшых суседзяу чым ...глія і Францыя—да цэнт...ьных дзяржавау.

...«Соцыялістычная» рэспуб...а з сваім безсіллем да твор... і продукцыйнай працы ...к даnякае бязладам гэтых ...дзей дзела, што яны нават ...рнець яе, як даунеи цярпе...ні могуць.

Разам с тым «прыяцель...я» захваты нідауніиі хаурусьнікамі на Далекім усходзе ...за пабярэжжы Белаго мора, ...оці каторых урад Леніна мо... пасылаць толькі «радіо» ...ына адзываюцца на іх пат...атычных пачуццях, і таму ...ы зьвертаюцца на захад.

Кадэты хаця ні цалкам ...вязаныя з гэтымі коламі, але ...ушая зауседы тлумачамі іх ...трэбау, цяпер прыслухоуваюцца і узважываюць усе за і ...оціу...

За тое палітычная арыентацыя з другога боку выяуляецца усе ясьней і ясьней. Кандуючыя колы коаліцыі ад ...маго пачатку рэволюцыі у ...асіі глядзелі с недавэраньсью на новы парадак прачуваючы, што ен можа пазбавіць іх ваеннаго хаурусьніка. Дзеля гэтаго і палітыка іх да рэвалюцыі была ністалай вагаючайся.

Коалянты кідаліся ад кадэтау да рэвалюцыянэрау, потым зноу назад, падтрымоувалі то тых то другіх, граючы зауседы ролю Керэнскаго—«главнопамэуляючаго» да вайны.

Але угаворы ні памаглі. Народ Вялікаросіі абезсілянай ніпатрэбнай вайною уповажніу большэвікоу зрабіць мір цаною аддання ім усей улады. Разгневаная коаліцыя на нейкі час адвярнулася ад ніверпаго хаурусьніка. Цяпер аднак мірныя адносіны якія паволі наладжываюцца паміж Вялікаросіяй і Цэнтральнымі дзержавамі абудзілі зайздрасьць дзержау коаліцыі. Яны зноу гатовы налепшыць стасункі с нівернай Расіяй.

Перашкодай гэтаму замеру з'яуляецца упомненае намі выжэй бажанне гандлева-прамысловых колау пашукаць апірышча у Нямеччыне. І вось выходзічы у Расіі францускі «Iournal» нідауна прачытау вострую натацыю рускаму буржуа і леніваму, і пужліваму, і занятаму клопатам толькі аб сваім палярасе.

А поруч з гэтым бышы ангельскі пасол у Расіі лорд Бьюкэнен нідауна у Петраградзе сказау прамову, якая падае духу і надзеі савецкім уладам знайшоушым ні бы зноу у Англіі прыхільніка. Асобна важнае значэнне прамова Бьюкэнепа мае таму, што за ім стаіць Бальфур.

«Мы ні павінны запамінаць, —сказау Бьюкэнен—вялікіх заслугау Расіі у пачатку вайны». У Англіі «павінны с пэунасьцю глядзець на будучыну і ні пераставаць цікавіцца усім, што у ей робіцца, каб у той час, калі наступіць момэнт рабіць, памагчы ей».

Мы ні ведаем якія праявы унутры Вялікаросіі выклікалі джэнтльмэнскі жэст сэра Бьюкэнэна да Вялікаросіі—голад, ніпарадкі на жалезьніцах, ці чырвоная армія, але думаем, што гэта жэст дарэмны. Коаліантам помачы цяпер ад яе... як ад Крыленка.

Ні можна аднак і надта пакладацца на зьмену у настроі гандлева - прамысловых колау Вялікаросіі. Трэба помніць дакор кінуты п. Васіленкам на украінскім кадэтскім з'ездзі—Англія на Бэрлінскім кангрэсі была проці аддання Расіі пралівау і Константынопалю.

Ідэя вялікай Імпэрыі ішчэ для іх жывая ідэя і пад доугі час будзе кідаць іх ад адной міжнароднай палітычнай камбінацыі да другой.

Лісты з вескі.

II.

«Голад—ні цётка» кажуць, але я німагу аніяк зразумець пры чым тут цётка? Чы хто мае цётку, той ні галадуе? Можа дауней так было, але цяперашнія цёткі гатовы ні толькі голаду, але і сухотау нагнаць.

Голад—гэта бацька: бацька эканоміі, ашчоднасьці і рожных выдумак. І калі мы да гэтаго часу ні зьверталі увагі на мудраго тату, то цяпер хоцькі-ні-хоцькі павінны яго паслухаць і тады, бадай, абойдзімся без уселякіх цётак.

Хто баіцца голаду ў Беларусі,—той нізнае Беларусі. Кожны чуў і ведае, як ішчэ да вайны амаль ні што год захопліваў голад той, чы іншы раіон Расіі; але чы хто чуў, каб да гэтых галодных раіонаў належала хоць адна беларуская губэрня?—ніколі!

Міліоны рублёў народных грошэй ішло на падкормліванне галодных людзей; плыл грошы і з Беларусі, але ні для беларусаў. Мы ніколі ні жылі багата, бо нашае багацце высмоктвалі з нас чужынцы, але голаду ні зналі.

А зьвярніце увагу на Беларусь за час вайны. Скольки яна вынесла на сваіх плячох! Рожныя наступленні, а ішчэ больш атступленняў; міліоны бежанцаў, для каторых Беларусь была першым этапам, апірашчам і першым сьвірнам; а шасьцісотвёрстны фронт праз стольки часу з яго старо-мангольскімі парадкамі; а цэлыя зграі, цэлыя хмары земсаюзных, земгорных і ліха ведае ішчэ якіх самаабаронцаў і нажыўнікаў, каторыя так аблюбавалі нашу старонку, што і цяпер сядзяць, паўпіваўшыся як клешчы, ў цела Беларусі—увесь гэты шквал магла вытрываць толькі Беларусь—Беларусь, загартаваная і варшаўскай «міласьцю» і маскоўскай нагайкай.

Беларусь—заўсёды міралюбная, да поту працавітая, запасовая,—нідаўна зруйнованая, спаленая, абкрадзеная,—цяпер,—канчаючы чацьвёрты год, гвалтам навязанай ёй, вайны,—павінна пракарміць ні толькі сябе, але і дачэсных сваіх гасьцей, якія выратавалі яе ад апошняй заглады нашай гаспадарнасьці—злоснаго большэвіцкаго паяцніцтва.

Мусім прызнацца і мусім гэта памятаваць: год будзе цяжкі. Спадчына леташняй разрухі— ніпэўная будучына давела нас да таго, што палеткі нашыя ні ў цэласьці абсеяны жытам, поле—на зіму загарана ні было і гэта адаб'ецца на каліцтве ураджаю.

Сатрапы «Сѣверо-западной области» са сваімі пасобнікамі-апрычнікамі, самі аткормліваючыся сытай жывёлай, кідалі тутэйшым жыхаром ахлапы цадыхаючай каніны. Чаго ніпатрапілі зьесьці, патрапілі зглуміць, зьніштожыць.

Цяпер Беларусь ні мае патрэбнай сілы ні ў жывым, ні ў мертвым інвэнтарах, ні хапае і насення. І дзеля гэтаго павінны мы ні толькі разлічаць на зерне, але і выкарыстаць кожную драбніцу, прыдатную для харчоўкі, якую толькі можа даць наш край.

Селета—мы ні будзем займаць вагонаў пад ракі для Англіі; мы ні будзем фатыгаваць Владывастоцкіх жыхароў распакоўкай з вярблюжай воўны нашых яблыкаў; ні будзем у стагі сыпаць грыбоў сваіх на маскоўскай «Сухарэўцы», ні будзем складаць у горы у мясных радох Пецярбургу зьвярыны лясоў і балот сваіх і прадуктаў нашай гаспадарскай гадоўлі,—не: селета Беларусь будзе рупіцца для Беларусі!

Дайце толькі лейцы ў яе гаспадарныя рукі, а ні ў рукі маскоўскіх фурманоў і яраслаўскіх эканомаў, а Беларусь вытрывае ішчэ і такі год і пакажа сваю сілу, свае права: сілу—на жывучасьць, права—на нізалежнасьць.

Я. Ш.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН 26/V. Бышы старшыня украінскай мірнай дэлегацыі і цяперашні пасол у Бэрліне, А. Севрук гэтымі днямі атрымаў прапанаванне да выезду; ён ужо пажагнаўся с панам фон-Кюльманам і праз сем дзён пакіне Бэрлін.

ВЕНА 25/V. Польскія легіоны. якія стаяць у Адэсі і ваколіцы, распушчаны па пастанові польскіх і украінскіх ўласьцей.

Так сама распушчаны польскія легіоны на Украіне у ваколіцы Хільнік. Ад іх забралі узброенне.

БЭРЛІН 26/V. А пратэсьці проціў міру паміж Румыніяй і цэнтральнымі дзержавамі «Nord. Allgem. Zeitung» так кажа:

«Гэты самы пратэст Румынскі урад проста прылажыць да сваіх актаў, якія вызначаюць лік абяцанак са стараны коаліцыі бышай румынскай дзержаве. Дзеля таго што урад Братыяна апіраўся на гэтыя самыя абяцанкі, Румынія ўцягнулася у праступную вайну. Дзеля таго, што коаліцыя ні патрапіла

выпаўніць свае абецанкі і аставіла Румынію на вой-вецер, цэнэральні Румынскі урад ўладзіў згоду. Над фатальнай главою палітыкі бышага ураду працягнута вяроўка на заўсёды. Пратэсты коаліцыі ні могуць на інчасце нічога зьмяніць у гэтым.

БЭРН 25/V. Nord. Allg. Zeit. кажа: Усіленае прыцягнаньня да войску францускіх рабочых, паводлуг дапесенні з Гэновы—выклікало у шмат мейсцох безпарадкі. З гэтай прычыны паведамляюць таксама з Ліона аб паўным паўстанні. З другіх крыніц прышлі весткі аб тым, што прыняты строгія меры «дзеля абезпечаньня свабоды рабочых» Значэнне гэтакіх слоў урада Клемансо лёгка зразумець.

Весткі з Расіі

— Бачучы **на харчовыя ніляды**, савецкі урад выдаў дэкрэт аб лішнім хлебе у прыватных ўласьнікаў. Подлуг дэкрэту кожны ўласьнік хлеба павінен усю лішку хлеба заявіць для здачы у тыднёвы срок пасьля выдачы дэкрэту. Усе бедныя селяне заклікаюцца да барацьбы с сельскімі багатырамі («кулакамі»). Усе маючыя хлеб і ні вывозячыя для сыпкі, а так сама саматушнікі залічаюцца ніпрыяцелямі народу, аддаюцца пад рэволюцыйны суд і караюцца астрогам ні менеі 10 гадоў. Іх мэнне конфіскуецца, а самі выганяюцца с обшчыны. Саматушнікі, апрача таго, падлегаюць прымусовай працы.

Знойдзены укрытым хлеб адбіраецца ад ўласьніка дарма а вартасць яго выплачваецца па палавіне: палавіна даношчыку, палавіна обшчыне.

Народнаму камісару харховых справаў даюцца шырокія поўнамоцніцтва. Дэкрэт ўведзены ў жыцце «по телеграфу».

— **Новым дэкрэтам** аб рэволюцыйных трыбуналах, яны захоўваюцца толькі у больших цэнтрах, (сталіцах, губ. гарадах, больших ж.-д. станц. і прамысловых цэнтрах). Усякія інныя месцовыя рэволюцыйныя суды касуюцца. Усе справы агульна крымінальнага характэру, перадаюцца у звычайныя суды. За трыбуналамі астаюцца толькі праступствы палітычнаго характэру, справы аб пагромах і «ніпраўным выкарыстанні савецкіх дакумэнтаў».

— **Дэкрэтам аб хабарніцтве**, усе хто будучы на службе земскай ці грамадскай пазволіць сабе прыняць ад каго нібудзь подкуп (хабар) караецца пазбаўленнем волі і прымусовай працай ні менеі, як на 5 гадоў. Так сама караюцца, тыя хто даюць хабары і тыя што нагаварываюць зрабіць гэта.

— **Правыя-соцыялісты рэволюцыян.** зьвярнуліся с прапановай да францускіх соцыялістаў каб выключыць большэвікоў з інтэрнацыяналу.

— **У Саратове** ад 16 да 20 гм. было паўстанне. Процi «савету» выступілі фронтовікі, якія абстрэлялі с гармат Селянскі банк і скарбовую камору. Савету удалося уцячы з гораду і з маленькай станцыі, вызваць большэвіцкае войско, якім паўстанне было згвалтовано. На усьмірэнне прыежджаў «сам» ваенны інспэктар Подвойскій.

— **У Владівастоку** з памешкання контр-разведкі выкрадзены усе дакументы.

Туды прыбыло шмат членаў Устаноўчнаго сойму і дэпутатаў сібірскай абластной Думы.

— **У Арле** пры новых выбарах гарацкога савету з 74 паслоў выбраных да 19 гм. было толькі 3 большэвікі і ні воднаго левага с.-р. Каля палавіны меньшавікі і правыя с.-р., правыя і цэнтр. Большая-ж частка—ніпартыйныя.

Тутака абезброены «красноармейцы» нарэкрутаваныя с кітайскіх кулі. Яны рабілі шмат ніпарадкаў і аказаліся нігоднымі да службы.

Ні глядзя на «соцыялістычныя» дэкрэты *большыя фінансісты сьпешаюцца* парабіць паміж сабой умовы на выпадак *узноуленьня* даўнейшай чыннасьці банкоў. Паведамляюць аб утварэнні новаго вялізнаго сындыкату, у які ўступілі прадстаўнікі гэтакіх банкоў: Петраградскаго міжнароднаго, Рускаго для заграничнаго гандлю, Волжска-Камскаго. Рускаго гандлёво-прамысловаго, Руска-Азіяцкаго, Сыбірскаго, Петраградскаго прыватнаго. Петраграградскаго—даўнейшаго Нэлькан і злучанаго.

Ленін у нідаўняй дэкларацыі аб працы ц. к. зьвязку мэталічнікаў, высказаўся: «На гарну трэба наставіць і папрабаваць на практыцэ *акортную плату*, прымяніць што есьць прогрэсыўнаго і навуковаго у *сыстэмэ Тэйлора.*

Мэталічнікі абстаіваюць інтэнсіфікацыю працы.

На беларускім шляху.

«Минскій Еженедѣльник», тыднёвік, які выходзіць замест «Минской Газеты» зьмешчае у № 1 ад 26 мая размову грамадзяніна Р. А. Скірмунта с сваімі супрадоўнікамі. Грамадзянін Р. А. Скірмунт даў адказы на цэлую шэрэнгу запытанняў, датычучых краевай палітыкі, каторыя прыводзім у перадачы «М. Еж.»

«Пытання момэнту.»

— Цяпер момэнт— начаў яг. Скірмунт —калі патрабуецца зьбіранне усіх інтэлігэнтных сілаў краю для творчай працы у дзеле аснавання Беларускай дзержаўнасьці. Партыйны склад, на якім да гэтых час асноўваліся, спусім ні адпавядае ні моманту, ні становішчу. Цяпер ідуць падгатаўчыя чыны для адбудавання Беларусі, як дзержавы. І трэба сабраць усе сілы, якія могуць быць карыснымі як у дзержаўна-творчай працы, так і для культурна-эканамічнаго адраджэння краю.

Беларусь—дзержава.

Р. А. Скірмунт выказаў перакананне, што пытанне аб Беларускай дзержаве, справа больш-меньш блізкай будучыны. І у гэтым найбольш зацікаўлена Нямеччына.

— Досыць паглядзець на мапу—кажа яг. Скірмунт—і зьвярнуць увагу на рубяжы Літвы і Украіны, каб пераканацца, што паміж гэтымі дзержавамі астаецца клін, каторы ні можа астацца выступам Расіі, а будзе асобнай дзержавай-Беларускай.

Бэрасьцейская умова—гэта «бакштэйн» (цэгла) ад якоі ідзець паварот гістарычных граніцаў, але ён далёкі ад найлепшасьці. Тамака ні было прадстаўнікоў інтарэсаў Беларусі і гэтымі інтарэсамі, натуральна, ні цікавіліся.

Рэальная праца.

Як толькі зробіцца спраможнай рэальная праца, на першы чарод выставяцца культурныя і эканамічныя пытанні. Глаўная увага будзе зьвернена на стварэнне сеці пачатковых беларускіх школаў пранятых нацыянальным духам. Ужо і цяпер пачаліся перагаворы з людзьмі навукі, каторыя здолаюць—у патрэбны момэнт—зрабіць арганізацыю прасьветы. На чарзе стаяць так сама пытання аб універсытэці і сельска-гаспінстытуце у Менску.

Аграрнае пытанне.

Німа сумления што пры адбудове Беларусі на першае мейсцо стане пытанне аб зямельнай рэформе.

— Грунтоўная земельная рэформа канечне патрэбна і яна будзе зроблена на культурных асновах. Трэба даць магчымасьць сельскаму насяленню нашырыць грунты малазямельных ўласьнікаў, за рахунак буйных землеўласьнікаў, але з другога боку культурныя гаспадаркі ні павінны руйнавацца і за зямлю павінно быць заплочано па справядлівай ацэнцэ.

Прыкладам можа быць Ірляндзія, у якоі у 1914 годзе аграрная рэформа здаволіла землярабоў і ні пакрыўдзіла землеўласьнікаў.

Палессе.

Гэта цэлы край, кажа Р. А. Скірмунт—каторы патрабуе культурнаго заваявання. Палескія балоты могуць даць 4 мільёны дзесяцін. зямлі, найлепшых лугоў і папасоў, цяпер уяўляюць толькі да нічога ніпрыдатную зямлю. Расійскі урад заўсёды быў мачыхай гэтаму краю і нідбаў аб яго інтарэсах.

Заключэнне.

Наагул ніспагадныя адносіны бышага расійскаго ураду да прасьветы стварылі цяпер ашні ніхват культурных сілаў, але на за тым на Беларусі маюцца усе элементы патрэбныя для будавання дзержавы.

У беларускім народзе захованы усе задаткі для прывіцця культуры і устройства ім свайго нізалежнаго дзержаўнаго жыцця.

Хаця беларусы і будуць баранiць нацыянальныя прынцыпы Беларусі, але уважаючы на шляхатны і толерантны характар беларускаго народу жыцце нацыянальных меньшасьцяў будзе саўсім забезпечаным».

Беларуская музыка.

Калі праўду казаць, беларуская музыка у цяперашні час натта бедная ні праз тое, што у беларусаў німа сваіх песьняў, а дзеля таго што вельмі мала запісана. Патрэбнаго ніколі німа пад рукою. У Менску заўсёды займаліся палітыкай, царскія слугі ніколі ні забоділіся аб нас—беларусах, а калі і успаміналі нашаго брата дык толькі адчыняючы турмы, пасылаючы у далёкую Сыбір.

Дзеля гэтаго мы вельмі ўзрадаваны тым, што прафэсар менскай кансэрваторыі І. Н. Устюжанінаў пачаў зьбіраць беларускія матывы і музыку для беларускай опэры.

Апрача гэтаго Устюжанінавым пішыцца музыка на словы сучасных беларускіх паэтаў. Ужо напісана добра і пекна музыка у новым стылю на словы сонэта М. Запольскаго «Павер ты мне»... у хуткім часе ім жа будзе напісана музыка для сольнаго і харавога сьпеву на словы розных беларускіх паэтаў.

Усё напісанае панам Устюжанінавым будзе сьпевацца у беларускім тэатры.

І. Н. Устюжанінаў просіць усіх, хто ведае якія колькеч народныя беларускія матывы, даведацца да яго.

Адрэс: Скобелеўская, 34.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У афіцэрскім бюро сягоння, 29 мая, павінны явіцца для паверачнай рэгістрацыі, на аснові апошняго прыказа нямецкіх уласьцей, афіцэры, дох дары і ваенныя чыноўнікі с карткамі ад № 901 па № 1201.

Закрытае пасядзэнне думскаго сеньорэн-канвэнта, у зьвязі з апошняю пераменаю, —адстаўкай меськ. галавы Кашчэнко і назначэннем Хржонстоускаго, адбылося у суботу, 25 мая.

Увесь склад гласных рашыу ні спыніць свайго поўнамоцтва да апошняй мажлівасьці.

Пакуль падалі у адстаўку члены управы—Зальманоў і Фрумкіна-Віхман.

Слухі аб роспуску губ. земуправы, упорна цыркуліраваўшыя па гораду 27 мая, аказаліся, па наведзеным справкам, ні адпавядаючымі праўдзе; па меньшай меры пасьпешныя.

Консульство украінскай дзяржавы пачало сваю працу у Менску у панядзелак, 27

Зноу назначаны консул украінскай дзержавы Іва... (б. таварыш пракурора, ... тым член Менскаго акр... ного суда) 24 мая быў у ... рускім Народным Пра... ніцтве, дзе меў гутарку с ... шыняю Сэкрэтарыяту Р. ... мунтам аб беларускіх спр...

На Троіцкім пляцу у ... дзелак, 27 мая, дровы п... валіся па 16—20 руб. за ... Канаплянае насенне — ... кварта. Каўбаса (толькі ... чна)—3 р. фунт. Кісла... чако—1 р. 20 к. кв.

Людзей было мало.

Кватэрны крызыс вельмі ... лабеушы у зьвязі з масс... ад'ездам з Менску ваен... —рознай прыватнай пу... прыняу дзіўны характар: ... болей, нават зашмат, сва... ных пакояў, а кватэр пр... што малавата.

Цэны на пакоі патан... два разы.

Выдача мяса жыхаром ... і 2-ай часьцей места ма... чацца с суботы, 1 чэрвен...

У бонавых крамах у ... дзелак, 27 мая, і аутора... мая, першая выдача па... чанаго хлебнаго пайка—па... ф. на душу—вышла як... жуць: «першы блін ком...

У большасьці крам х... ні выдавалі дзеля нідахва...

Нямецкі тэатр «Усх... фронт», каторы за свае ... сяціемесячнае існаванне, ... таваў сабе у нямецкіх ваен... так сама у мейсцовых ж... розу самае лепшае рэна... поглядзу штукі, і быў ус... пажаданым гасьцем, пр... жае у Менск для развлеч... салдат і мейсцовых жыха... ставючы сабе мэтай абзн... леннне іх з нямецкім шту...

Трупа тэатра «Усх... фронт», у складзе с 7-мі ... тысяч і 13-ці артыстау зна... дзіцца пад ніпасрэдным кі... ніцтвам Глаунокамандую... фронтам.

Артысты, будучы на в... най службе, так і арты... выступалі у лепшых нямец... тэатрах, як: «нямецкі тэат... Бэрліне», «Прыдворны т... у Мангэйм», у «Мюнхэне», «Гамбург», у «Брэмене», «Карлсруэ», «Гэра», і г. д.

Гастролі у Менску пачн... юцца у сераду 29 мая у М... кім тэатры (Петропалоус... вул.) На адчыненне пастаул... оудзе камэдыя Отто Эр... «Флаксман, як выхаваў... прайшоўшая праз усе вядом... сцэны Германіі і карыстаў... агромадным усьпехам:

Пачатак а 9 гадзіне вечар...

Цэны і далейшыя п... робнасьці будуць апавешч... у афішах.

Курсы беларусазнаўства.

29 мая лекцыя праф. М. М... сонуса «Гісторыя беларуск... мовы».

Пачатак а 7 гадз.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.